# Іван Іларыёнавіч БАГДАНОВІЧ

21 чэрвеня пасля цяжкай і працяглай хваробы на 83-м годзе жыцця памёр заслужаны ўрач Беларускай рэспублікі, былы рэктар Віцебскага медыцынскага інстытута Іван Іларыёнавіч Багдановіч.

Пайшоў з жыцця вялікі вучоны і педагог, які даў медыцынскай практыцы сотні спецыялістаў, падрыхтаваў дзесяткі навуковых работнікаў.

І. І. Багдановіч нарадзіўся ў 1893 годзе ў мястэчку Копыль былога Слуцкага павета Мінскай губерні ў сям'і селяніна.

У 19-гадовым узросце ён закончыў Магілёўскую фельчарскую школу і працаваў затым у земскай бальніцы і Бабруйскім ваенным шпіталі.

Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя адкрыла сыну селяніна шлях у навуку. У 1921 годзе І. І. Багдановіч закончыў медыцынскі факультэт Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта. З 1921 па 1935 год працаваў ардынатарам, асістэнтам, а затым дацэнтам Мінскага медыцынскага інстытута. З 1935 па 1941 год загадваў кафедрай скурна-венерычных хвароб Віцебскага медыцынскага інстытута.

Вярнуўшыся ў 1944 годзе ў вызвалены Віцебск, І. І. Багдановіч з 1946 года працаваў



прарэктарам па навуковай і вучэбнай рабоце Віцебскага медыцынскага інстытута, а ў 1951 годзе ўзначаліў яго. Працуючы рэктарам медыцынскага інстытута на працягу 10 год, аж да ўходу на заслужаны адпачынак, І. І. Багдановіч праявіў выдатны талент арганізатара, здабыў сабе любоў і павагу ўсяго калектыву. Шмат сіл і энергіі ён уклаў у аднаўленне разбуранага вайной інстытута, у будаўніцтва і аднаўленне яго кафедраў, іх аснашчэнне. Пры яго садзейнічанні ў 1959 годзе ў Віцебскім медінстытуце быў адкрыт факультэт па падрыхтоўцы правізараў.

І. І. Багдановіч аказваў значную практычную дапамогу органам аховы здароўя ў падрыхтоўцы і спецыялізацыі ўрачоў. Удумлівы і ўважлівы педагог, ён удзяляў вялікую ўвагу паляпшэнню ідэйна-палітычнай работы сярод прафесарска-выкладчыцкага саставу і студэнтаў, удасканальванню вучэбна-выхаваўчага працэсу.

Аўтар больш чым 40 навуковых прац, І. І. Багдановіч унёс значны ўклад у медыцынскую навуку.

І. І. Багдановіч двойчы выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, быў членам Віцебскага абкома КП Беларусі, дэпутатам Віцебскага гарадскога і абласнога Саветаў дэпутатаў працоўных, вёў актыўную работу сярод насельніцтва.

Шматгадовая навуковая і грамадская дзейнасць І. І. Багдановіча высока ацэнена партыяй і ўрадам. Ён узнагароджан ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, чатырма медалямі, яму было прысвоена званне «Заслужаны ўрач БССР».

Светлая памяць аб І. І. Багдановічу назаўсёды захавяецца ў сэрцах усіх, хто яго ведаў і працаваў разам з ім.

**С. М. Шабашоў, П. Я. Рубіс, І. А. Шыбека, М. Я. Саўчанка, В. І. Мяцеліца, М. І. Дзямянцей, А. С. Пракоф'ева, Л. С. Фірысанаў, К. М. Аніщчанка, Л. П. Марынкевіч, В. В. Міхельсон, В. С. Русак, Я. В. Касарэўскі, А. С. Каваленка, Ц. П. Шарыпаў, М. У. Дарафеенка, Я. М. Глушкевіч, У. Ф. Кузьмін, І. А. Навумчык, А. Д. Палейка, В. П. Вараб'ёва, А. А. Шчарбакоў, Г. Н. Ляонава, У. П. Красянкоў, Я. Д. Антоненка, Л. І. Руднік, І. А. Інсараў, Я. М. Славенка, Н. Ф. Шаўчэнка, Я. Н. Мядзведскі, Н. С. Навіцкі, І. Н. Сіпараў, Г. А. Мядзведзева, М. У. Дзянісава, А. А. Ключараў, Д. А. Маслакоў, Г. М. Прус, М. М. Янчур і іншыя.**